# Змест

**Частка 1.** Вытокі надзеі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
**Частка 2.** Віры сечаў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 284
**Частка 3.** Плыні лёсаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 536
**Частка 4.** Рэкі памяці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .777



# 1

Імжа сыпалася ад самага ранку. Серабрыста-шэрае туманнае марыва падымалася над далінай Вугеры да самага неба, быццам завешанага шэрым радном. Дарога вілася між невысокіх узгоркаў, зарослых серабрыстым палыном, а па левую руку з абрыву бачна было, як над сцішанай Вугерай далёка ўнізе паступова пачынае падымацца туман. Вечарэла, сыры вецер станавіўся ўсё больш халодным і пранізлівым.

Над сінімі гарамі на захадзе, там, куды несла свае хвалі рака, трохі развіднела, так што над частым грэбнем шызага лесу паказалася ружовая палоска. Хмары там нібы ўцягвалі ў сябе колеры, расквечваліся ўсімі адценнямі ад блакітнаватага і пяшчотнага ліловага да насычанай барвы над самай ранаю неба.

Донай, пазяхаючы, сонна глядзеў на раку, на крывавы захад, на жамчужныя хвалі туману над далёкай вадой, што падавалася амаль чорнай. Сказваліся дзве бяссонныя ночы і дзядзькава даручэнне, якое не магло чакаць. Тут, у Парэччы, на самай мяжы Вугеркі з Навіполем было неспакойна. Новы навіпольскі князь, малады Тарс, які нядаўна змяніў бацьку на троне, апошнім часам надта зацікаўлена паглядаў на бліжэйшыя да яго землі Вугеркі і ад паглядаў вось-вось мусіў перайсці да дзеянняў. Прынамсі, так пераказалі князевы шаптуны, спрэс бескалёрныя, незаўважныя, слізкія, з ліпкімі позіркамі бляклых вачэй, падобных да тхарыных. Шаптуны лёталі па начах з вугеркаўскага замка ў ружыцкі, трушком прабягалі па калідорах, праслізгвалі ў пакоі ціхутка, як цені, і, быццам цені, амаль адразу ж знікалі. І тое, што гэтыя шапяткія тхары з'ўляліся ўсё часцей і часцей, магло азначаць толькі адно: набліжэнне вайны.

Абоз, які Донай суправаджаў з Кудравіц, вёз у цяжкіх скрынях з княжымі гербамі зброю. Мячы, дзіды, стрэлы і лукі. Усё, што кудравіцкія майстры, слынныя і ў Вугерцы, і за межамі княства, змаглі ахвяраваць дзеля вырашэння трапяткога зямельнага пытання. Зрэшты, скрыняў было ўдвая меней, чым меркаваў дзядзька, і ўтрая меней, чым спадзяваліся ў княжым замку. Магчыма, таму, што князь Алізар, верагодней за ўсё, планаваў разлічвацца з кудравічанамі абяцаннямі: тое золата, што адвёз ім Донай, наўрад ці магло пакрыць усе ранейшыя выдаткі. У Кудравіцах спела незадаволенасць — яе можна было выразна адчуць у цяжкіх позірках на патыліцы, у падкрэсленай сухаватай ветлівасці кудравіцкага войта, у яўна змушанай нешматслоўнасці маладых падмайстраў і вучняў, заўжды такіх цікаўных і балбатлівых.

Войны — справа дарагая, мляўка думаў Донай. Вымагае спачатку шмат золата, а пасля — шмат крыві, сваёй ці чужой, без розніцы. Думкі варочаліся ў ягонай галаве без асаблівай ахвоты, цяжкія, няўклюдныя, нібы таксама стылыя ад халоднай восеньскай імжачкі. Донай ленавата цёр далоні адна аб адну, хукаў на задубелыя пальцы. Воз падкідвала, патрэсвала, з-пад колаў з хлюпаннем рассыпаліся камякі вільготнага бруду. За гэтым возам цягнуліся, адзін за адным, яшчэ з паўтузіна: усе аднолькавыя, з навесамі з бруднаватай дзяругі, запрэжаныя ламавымі коньмі, што пакорліва мясілі гразкую дарогу капытамі. Двое конных княжых дружыннікаў пляліся ў самым хвасце — уласна, усё суправаджэнне для кудравіцкай зброі, апроч пары служак ды фурманаў.

Зрэшты, у тым і была дзядзькава задумка: асаблівай аховы быць не павінна. Хай навіпольцы, калі сочаць за дарогай з Кудравіц, мяркуюць, быццам гэта — звычайныя гандляры. Дзясятак узброеных вояў побач з абозам выклікаў бы падазронасць, асабліва ўлічваючы напружанне на мяжы.

— Ціха паедзем, як мышкі, каб іх трасца, — казаў дзядзька, калі выпраўляў у дарогу. Закашляўся, захрыпеў, хапаючыся за грудзі: прыступы цяпер накотвалі на яго часцяком, дзень па дні не лепшала. Дзядзька свайго нездароўя саромеўся, спрабаваў прыхаваць, ды выходзіла кепска.

— Мусіў бы сам, — працадзіў ён праз зубы, адкашляўшыся. — Сам! Ганьба — малых змушаць замест сябе.

«Малым» — Донаю і ягонаму брату — было без малога дзевятнаццаць год. Абодва высокія, шырокія ў плячах, моцныя, але без дзядзькавай мажной цяжкасці, танклявыя, хуткія і жвавыя. Абодва — дзядзькавымі намаганнямі — добра ведалі, з якога канца брацца за меч, ды і з лука не ў неба цалялі. Абодва ўжо некалькі гадоў насілі панцыры княжага дружынніка з гербам Вугеркі — раз'юшаным чорным мядзведзем, што падняўся на дыбкі. Праўда, зброю ў руках ім пакуль даводзілася трымаць адно, можа, на паляваннях ды турнірах, якія так любіў ладзіць гасцінны дзядзька і на якія з'язджаліся з ваколіц усе бліжэйшыя суседзі.

Донай цяжка ўздыхнуў: магчымая вайна з Навіполем, калі па шчырасці, клапаціла яго значна меней, чым дзядзькава хвароба. Той, каго ён памятаў магутным, быццам дуб, ці, можа, быццам той жа гербавы мядзведзь, за пару апошніх год, неяк аж занадта хутка згорбіўся, высах. У густых цёмных валасах з'явіліся частыя ніткі сівізны, нібы ўблытанае павуцінне, твар пажаўцеў, а ля роту заляглі горкія глыбокія зморшчыны. Лекары, мабыць, дапамаглі б хоць нечым — але дзядзька не надта верыў нават замкаваму лекару, і ўсе зеллі, дэкохты і ўзвары прападалі марна. Ды што там, нават змусіць яго адпачыць было справай неверагоднай. Дзядзька і гэтым разам паехаў бы па княжай патрэбе сам, як рабіў штораз, але за дзень да таго злёг і папросту не меў сілы падняцца.

І ўвесь гэты час, дзве бяссонныя ночы і тры пустыя дні, якія не мог запоўніць шэры абоз пад шэрым небам, Донай

думаў пра дзядзьку — як там стары ёлуп маецца, ці так жа душыць яго кашаль, ці адступіла гарачка. Стары заўжды быў роднай душой, не самай, можа, сур'ёзнай, не самай пяшчотнай ці ўважлівай, але — сваёй. Дзядзьку, нават з ягонымі вечнымі прыступамі гняўлівасці, з неадольнай прыхільнасцю да моцнай выпіўкі і паляванняў, з неймавернай упартасцю і звышнатуральнай здольнасцю загібаць лаянку, Донай любіў. І ад думкі, што гэтае сваё, роднае можа знікнуць назаўсёды, яму станавілася горка і страшна.

Аднак апроч той амаль звыклай ужо трывогі, што аддавала на смак палыновай горыччу, было нешта яшчэ: маленькі чарвяк неспакою, які варушыўся на самым дне душы. Свінцовая іголачка ў сэрцы. Гэты неспакой не даваў спаць, гнаў Доная лішні раз абысці ўсе вазы падчас рэдкіх прывалаў, адбіраў смагу і голад. Халадок поўз па шыі, штось абрывалася пад сэрцам, нямелі рукі — і Донай скрыгатаў зубамі, і адчуваў неяк усім целам, усёй сутнасцю, ведаў, чуў, бачыў: нешта не так. Нешта насоўвалася на яго, на іх усіх, з пагрозлівай неадхільнасцю, і ад гэтага да горла падкотвала млосць, і ён, пераадольваючы слабасць, ізноў ішоў, правяраў скрыні, кружыў вакол абоза, лаяў дазорных — на дзядзькаў мудрагелісты манер, ажно дружыннікі захоплена прысвіствалі.

Цяпер, праўда, трохі палепшала. Можа, таму, што знямажаны Донай нарэшце сеў адпачыць у першым з вазоў, а не тросся ў сядле. Можа, таму, што спінай да спіны побач сядзеў Вельс, брат. Суцяшальнае, роднае цяпло, непарушнае апірышча, як было заўжды, як будзе заўжды. Колькі Донай сябе памятаў, брат быў побач: на паўкроку ззаду, дзіцячаю далонькай далікатна трымаючы — быццам прытрымліваючы — за рукаў. Заўсёды такі рахманы знешне, заўсёды з лёгкай усмешкаю, з яснымі вясёлымі вачыма, у якіх і ценю пакорлівасці не было. Той жа, што і ў Доная, вузкі твар з упартым падбароддзем, з прамым носам, з высокімі скуламі,

з цёмнымі бровамі ўразлёт, той жа разрэз і колер вачэй, тое ж ледзь прыкметнае залацістае рабацінне, нават нахіл галавы. Усё тое ж — а выраз твару зусім іншы, і валасы, такія самыя, залаціста-русыя, не тырчаць падстрыжанымі віхрамі, а спакойнымі хвалямі кладуцца на плечы.

Вельс яшчэ ўчора, здаецца, зрэзаў у прыдарожных хмызах нейкі пруцік і ўвесь мінулы вечар старанна завіхаўся з ім. А раніцай ён самааддана, з імпэтам дзьмуў у самаробную дудку. Атрымлівалася, мякка кажучы, не надта.

— Дальбог, — сіпла загаварыў вусаты фурман, змрачнаваты, маўклівы кудравічанін, ад якога за ўсе дні і слова не пачулі. — Рыхтык ката дзвярыма заціснулі. І падпалілі.

Донай зарагатаў: надта жывая і, галоўнае, блізкая да праўды атрымлівалася карціна. Вельс таксама засмяяўся, але дурную сваю дудку не кінуў, вось і цяпер важдаўся з ёю, нешта калупаў нажом, з імпэтам прадзьмуваў адтулінкі і за працаю досыць фальшыва насвістваў, ажно зводзіла зубы. Донай доўга цярпеў, моршчыўся і нарэшце сунуў яго локцем у бок.

— Не зайздросці, злыдзень, — азваўся Вельс, паціраючы рэбры. — Я і табе таксама дудку зраблю. Хочаш?

— Не.

— А як зраблю, то, нябось, захочаш.

Ад Вельсава голаса, ад смешкаў ды кепікаў, хай і бязглуздых, зрабілася трохі лягчэй. Неспакой, праўда, усё яшчэ жыў унутры, але неяк зацёрся, змарнеў. Можна было глядзець на дарогу, на астатнія вазы, што караскаліся на крутабокія ўзгоркі следам, і думаць толькі пра дзядзьку. Яшчэ з паўдня дарогі — і яны будуць дома, у Ружыцы. Дзядзька стане бухаць кашлем і са смакам лаяцца — на сваю хваробу, на замкавага лекара, на самога сябе, на ўсё на свеце. А за вячэрай адчуе сябе амаль здаровым, пачне адпускаць жарты і расказваць свае байкі з палявання: пра небывалага белага ваўка, ці пра лясных цмокаў, ці пра…